This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Instytut Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2025.pp.45-71

Przegląd Środkowo-Wschodni, 10, 2025
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20251002

Data przesłania: 12.05.2025
Data akceptacji: 17.06.2025

**Уладзімір Падалінскі**
незалежны даследчык
ulpadalinski1978@gmail.com
ORCID: 0000-0002-6204-2033

# Карчма, манастыр, магістрат: сацыяльныя адносіны ў Магілёве на фоне асобнага канфлікту 1577 г.

## Karczma, klasztor, magistrat: stosunki społeczne w Mohylewie na tle konfliktu w 1577 roku

Artykuł traktuje o stosunkach panujących w społecznościach miejskich na wschodnich ziemiach Wielkiego Księstwa Litewskiego pod koniec XVI w. na przykładzie pewnego konfliktu. Konflikt ten miał miejsce w Mohylewie w kwietniu 1577 r. Wybuchł on tuż po Wielkanocy, najważniejszym święcie chrześcijaństwa, w Poniedziałek Wielkanocny. Doszło do niego w kluczowych miejscach życia miasta – karczmie, klasztorze i magistracie. W konflikcie uczestniczyli członkowie różnych stanów i grup społecznych – mieszczanie, szlachta i duchowni prawosławni. Pomimo wysokiego poziomu przemocy obie strony konfliktu rozstrzygnęły wszystkie roszczenia pokojowo, nie czekając na decyzję sądu. Naszym zdaniem ten właśnie przypadek świadczy o powiązaniach i ścisłej interakcji między różnymi grupami społeczności miejskiej, ich normach i wartościach, mentalności i wzorcach zachowań. Na przełomie XVI i XVII w. Mohylew był jednym z najbardziej rozwiniętych miast Wielkiego Księstwa Litewskiego i odgrywał ważną rolę w rozwoju handlu i rzemiosła w górnym dorzeczu Dniepru. Chociaż historia Mohylewa ma bogatą historiografię, to jednak lokalna społeczność miejska dotychczas nie została gruntownie zbadana przez historyków. Niniejszy artykuł opiera się na analizie pierwszych ksiąg magistratu mohylewskiego, które przetrwały do dziś. Metodologiczną podstawą tej analizy jest studium przypadku. Artykuł dowodzi, że badania lokalnych konfliktów umożliwiają dogłębne poznanie historii społecznej Wielkiego Księstwa Litewskiego.

Słowa kluczowe: stosunki społeczne, konflikt, społeczność miejska, prawo patronatu, Wielkie Księstwo Litewskie, Mohylew, studium przypadku

## Уводзіны

Паўночнаамерыканская даследчыца Наталі Зэман Дэвіс (1928–2023) у адным са сваіх артыкулаў адзначала, што новая сацыяльная гісторыя надае важнае значэнне тым падзеям, якія ілюструюць, як у мінулым перапляталася прадпісанае і выпадковае, а ў якасці сюжэтаў для вывучэння аддае перавагу выбраным, часта лакальным і драматычным, выпадкам[1]. На нашу думку, такімі падзеямі, пад час якіх на фоне парушэння ўсталяванага ладу жыцця выразна выяўляліся агульнапрызнаныя ў пэўнай супольнасці каштоўнасці, правілы і нормы, з'яўляюцца лакальныя канфлікты. Адпаведна, іх аналіз дае магчымасць адлюстраваць сацыяльную і культурную спецыфіку развіцця таго ці іншага грамадства як на мясцовым, так і на рэгіянальным або дзяржаўным узроўні[2].

У красавіку 1577 г. у Магілёве адбыўся даволі значны і гучны канфлікт, які прыцягвае да сябе ўвагу ўсім – часам, месцам, удзельнікамі і вынікам. Так, ён адбыўся адразу пасля Вялікадня, важнейшага хрысціянскага свята, у вялікодны тыдзень. Яго падзеі разгортваліся ў ключавых аб'ектах гарадскога жыцця – карчме, манастыры і магістраце. У канфлікт былі ўцягнуты прадстаўнікі розных саслоўяў і сацыяльных груп – мяшчане, шляхта, праваслаўнае духавенства. Нарэшце, нягледзячы на даволі цяжкі склад злачынства, бакі ўлагодзілі ўсе прэтэнзіі палюбоўна і мірна, не даводзячы справу да судовага разбіральніцтва. Звесткі аб гэтых падзеях утрымліваюць першыя актавыя кнігі Магілёўскага магістрата[3],

---

[1] N. Zemon Davis, *The Shapes of Social History*, "Storia della Storiografia" 1990, vol. 17, f. 2, p. 28–29.

[2] Аб спалучэнні падыходаў мікра- і макрагісторыі ў даследаванні грамадства мінулых эпох гл. напр.: N. Zemon Davis, *The Shapes of Social History*, p. 31–33; Л.П. Репина, *Историческая наука на рубеже XX–XXI вв.: социальные теории и историографическая практика*, Москва 2011, с. 163–176.

[3] Нагадаем, што кароль польскі і вялікі князь літоўскі Стэфан Баторый па просьбе магілёўскіх мяшчан і за хадайніцтвам магілёўскага старосты Аляксандра Хадкевіча надаў Магілёву магдэбургскае права ў студзені 1577 г.: *Акты, от-*

якія захавалася і былі апублікаваны ў пачатку XX ст.[4] Менавіта яны і сталі галоўнымі крыніцамі нашага даследавання. Падкрэслім, што гісторыя Магілёва другой паловы XVI ст. не засталася па-за ўвагай гісторыкаў[5]. Даволі добра вывучаны развіццё рамесных і сельскагаспадарчых заняткаў гараджан, цэхавая арганізацыя, гандлёвыя сувязі і сацыяльная тапаграфія горада. Разгледжана яго грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове XVI–першай палове XVII ст.[6] Таксама была зроблена спроба ахарактарызаваць розныя бакі светапогляду і штодзённага жыцця магілёўцаў у перыяд ранняга Новага часу[7]. Дарэчы, канфлікт, які будзе разгледжаны ў нашым артыкуле, ужо быў згаданы ў гістарыяграфіі[8], але згадкі гэтыя маюць выключна фрагментарны характар. Сам канфлікт і звязаныя з ім падзеі да гэтага часу не былі прадметам асобнага даследавання. Адразу адзначым, што разглядаючы канфлікт 1577 г. мы не хацелі б скажаць агульную карціну існавання гарадской супольнасці Ма-

---

*носящиеся к истории Западной России, собранные и изданные археографической комиссией* (АЗР): в 5 т., т. 3 (*1544–1587*), СПб. 1848, с. 202–206.

[4] *Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией* (АВАК): в 39 т., т. 39: *Акты Могилевского магистрата XVI в. (1578–1580 гг.)*, Вильна 1915; *Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской* (ИЮМ): в 32 вып., вып. 30, Витебск 1903; вып. 32, Витебск 1906. Шэраг актаў з магістрацкіх кніг Магілёва апошняй трэці XVI–першай трэці XVII ст. быў надрукаваны яшчэ ў 1870-я гг.: *ИЮМ*, вып. 7, Витебск 1876, с. 273–511; вып. 8, Витебск 1877, с. 197–530.

[5] Сярод важнейшых даследаванняў, прысвечаных гісторыі Магілёва ў перыяд Сярэднявечча і ранняга Новага часу, назавем працы, якія ўбачылі свет яшчэ ў канцы XX ст.: H. Łowmiański, *Studia nad dziejami Wielkiego Księstwa Litewskiego*, Poznań 1983, s. 467–530; І.А. Марзалюк, *Магілёў у XII–XVIII стст. Людзі і рэчы*, Магілёў-Мінск 1998; В.И. Мелешко, *Могилев в XVI–середине XVII в.*, Минск 1988. У гэтых работах гл. таксама падрабязны пералік крыніц і даследаванняў па гісторыі горада.

[6] Праўда, выключна ў межах савецкага класавага падыходу: В.И. Мелешко, *Могилев в XVI–середине XVII в.*, с. 160–225.

[7] І.А. Марзалюк, *Магілёў у XII–XVIII стст.*, с. 79–143.

[8] Ф. Жудро, *История Могилевского Богоявленского братства*, Могилев на Днепре 1890, с. 8–9; І.А. Марзалюк, *Магілёў у XII–XVIII стст.*, с. 94.

гілёва. Жыццё гараджан было markdownразнабаковым і насычаным ды не зводзілася да пастаянных судовых працэсаў[9].

Увага гісторыкаў да мінулага гэтага беларускага горада не павінна здзіўляць. У другой палове XVI ст. Магілёў з'яўляўся адным з найбольш сацыяльна і эканамічна развітых гарадоў Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Ён меў вельмі моцную і ўплывовую мяшчанскую супольнасць, а таксама не зведаў разбурэнняў у час першага этапу Інфлянцкай вайны (1558–1570 гг.). У 1560-я гг. паводле норм дзяржаўных падаткаў Магілёў уваходзіў у лік васьмі найбольш заможных гарадоў ВКЛ[10]. Па розных ацэнках, яго насельніцтва ў 1577 г. складала 6,5–10 тысяч чалавек[11]. Магілёў знаходзіўся на тэрыторыі Аршанскага павета Віцебскага ваяводства. І хаця павятовай сталіцай была Орша, якая на мясцовым узроўні выконвала ваенна-палітычныя функцыі, але Магілёў у перыяд ранняга Новага часу з'яўляўся буйнейшым сацыяльна-эка-

[9] Агульную характарыстыку жыцця сярэднявечнага еўрапейскага горада, якая шмат у чым стасуецца і да гарадоў ВКЛ XVI ст., гл. у: А.Л. Ястребицкая, *Город*, [w:] *Словарь средневековой культуры*, под общ. ред. А.Я. Гуревича, Москва 2003, с. 113–120. Падкрэслім, што пад тэрмінам "гарадская супольнасць" разумеем не толькі мяшчан, але таксама прадстаўнікоў іншых слаёў і сацыяльных груп (перадусім, шляхты і духавенства), якія пражывалі ў горадзе і былі непасрэдна ўключаны ў розныя сферы яго жыцця. Аб ролі гарадоў у развіцці рэгіянальных супольнасцяў і культур, гл. напр.: C. Phythian-Adams, *Local History and Societal History*, "Local Population Studies" 1993, no. 51, p. 39–40.

[10] М.В. Доўнар-Запольскі, *Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах*, падрыхт. да друку: А.І. Груша, Р.А. Аляхновіч, Мінск 2009, с. 707–712. А калі ўлічыць акупацыю Полацка (1563) і паходы маскоўскіх войскаў на Віцебск ды яго ваколіцы (1562, 1568), то месца горада ў такім "рэйтынгу" будзе яшчэ больш высокім. Акрамя таго, Магілёў быў цэнтрам адной з буйнейшых дзяржаўных валасцей ВКЛ: В. Насевіч, *Магілёўская воласць*, [w:] *Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя*, у 2 т., т. 2, рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш., 2-е выд., Мінск 2007, с. 245–246.

[11] І.А. Марзалюк, *Магілёў у XII–XVIII стст.*, с. 96, 163; В.И. Мелешко, *Могилев в XVI–середине XVII в.*, с. 20. Паводле падыходаў сучаснай гістарычнай дэмаграфіі (гл. напр.: P. Łozowski, *Rodzina w Starej i Nowej Warszawie w XV i początkach XVI wieku*, Białystok 2021, s. 59–75), насельніцтва Магілёва ў 1577 г. магло складаць, хутчэй за ўсё, ад 5 да 6,5 тыс. чалавек.

намічным і духоўным цэнтрам беларускага Падняпроўя. Аднак нягледзячы на такі статус і даволі прадстаўнічую базу захаваных крыніц, сацыяльная прастора горада, з усімі характэрнымі для яе сувязямі і кантактамі, сімваламі і ўяўленнямі, агульнасцю і адметнасцю, усё яшчэ патрабуе свайго грунтоўнага даследавання. Такім чынам, мэтай артыкула з'яўляецца на прыкладзе выбранага выпадку адлюстраваць асаблівасці сацыяльных адносін у гарадской супольнасці на ўсходніх землях ВКЛ у канцы XVI ст.

## Канфлікт і яго бакі

У вялікодны панядзелак, 8 красавіка 1577 г., «*сталъ се кгвалтъ у манастыри Светого Спаса*»[12]. Тым святочным днём у карчме, якая размяшчалася ў доме карчмара Філіпа Крывога, сабраліся «*многие*» магілёўскія мяшчане. Падобна, што гэты сход уяўляў з сябе традыцыйную "бяседу" ці "братчыну" – неафіцыйную частку агульнагарадскога свята[13]. Як пазней даводзіў бок абвінавачвання, канфлікт нібыта пачаўся ўжо ў карчме. «*Повадившисе сами межи собою въ корчме*», мяшчане накіраваліся ў манастыр Святога Спаса, дзе «*почали на квалтъ звонит у больши звонъ*»[14]. Матэрыялы справы называюць найбольш актыўных удзельнікаў падзей з боку мяшчанства: Аўсея Максімовіча, Арцёма Дуплю, братоў Марціна і Ермака Кавалёў (Кузняцоў), Юрку Кулаковіча (Кулака), Ждана Трысніча, Ярмолу Мікалаевіча і Юрку Лукашэвіча. Сярод гэтых людзей былі як рамеснікі, так і купцы, г.зн. прадстаўнікі асноўных груп магілёўскага мяшчанства. Так, Марцін Каваль з'яўляўся кавалём,

[12] *АВАК*, т. 39, с. 39; *ИЮМ*, вып. 7, с. 282. У 1577 г. Вялікдзень прыпадаў на 7 красавіка: *ИЮМ*, вып. 30, отд. 3, с. 3.

[13] І.А. Марзалюк, *Магілёў у XII–XVIII стст.*, с. 118.

[14] Падрабязнае апісанне канфлікту прыводзіцца ў выпісе гродскага суда Аршанскага павета, выдадзеным па просьбе пацярпелага боку адразу пасля падзей у манастыры: *АВАК*, т. 39, с. 60–62; *ИЮМ*, вып. 7, с. 288–293. Астатнія дакументы, звязаныя з гэтай справай, удакладняюць некаторыя дэталі здарэння.

а яго брат Ярмак – шубнікам, а вось Ждан Трысніч згадваецца як «*римарчикъ*»[15], г.зн. рамеснік па вырабу конскай вупражы. У сваю чаргу, Арцём Дупля і Аўсей Максімовіч з’яўляліся купцамі. Першы з іх займаўся, хутчэй за ўсё, дробным гандлем[16], а другі ўвогуле належаў да гарадской эліты. Род Максімовічаў адыгрываў значную ролю ў знешнім гандлі Магілёва, перш за ўсё, з Маскоўскай дзяржавай[17]. Максімовічы займалі вышэйшыя пасады ў гарадскім самакіраванні. Так, у канцы XVI ст. Сяргей Максімовіч з’яўляўся лаўнікам і бурмістрам, а Харка Максімовіч – лаўнікам і нават лентвойтам (намеснікам войта)[18]. Сам Аўсей таксама будзе займаць уплывовыя пазіцыі ў сацыяльнай эліце горада. Так, у 1588 г. ён стане бурмістрам Магілёва, а ў 1593 г. магілёўскі войт Марцін Стравінскі прызначыць яго адным са сваіх намеснікаў[19].

На дзеянні мяшчан адрэагаваў магілёўскі пратапоп Сасін Захарыніч. Менавіта ён трымаў Спаскі манастыр па даручэнні новапрызначанага архіепіскапа полацкага, віцебскага і мсціслаўскага Феафана Багдана Рыпінскага[20]. Па словах пратапопа, ён пачуў звон

---

[15] Гл. напр.: *АВАК*, т. 39, с. 40, 60, 62; *ИЮМ*, вып. 32, ч. 1, с. 221. Аб развіцці рамяства і рамесных цэхах у Магілёве гл.: В.И. Мелешко, *Могилев в XVI–середине XVII в.*, с. 17–93.

[16] Гл. напр.: *АВАК*, т. 39, с. 8–9, 40; *ИЮМ*, вып. 7, с. 283. Гандлёвыя сувязі магілёўскага мяшчанства ўжо даволі добра разгледжаны ў гістарыяграфіі: H. Łowmiański, *Studia nad dziejami Wielkiego Księstwa Litewskiego*, s. 508–530; В.И. Мелешко, *Могилев в XVI–середине XVII в.*, с. 94–145.

[17] В.И. Мелешко, *Могилев в XVI–середине XVII в.*, с. 111, 112, 135, 162, 163. Буйныя купцы Максімовічы займаліся таксама і ліхвярствам.

[18] *АВАК*, т. 39, с. 97, 100, 104 і інш.; *ИЮМ*, вып. 7, с. 343–344; В.И. Мелешко, *Могилев в XVI–середине XVII в.*, с. 179.

[19] *ИЮМ*, вып. 7, с. 417; вып. 8, с. 210; В.И. Мелешко, *Могилев в XVI–середине XVII в.*, с. 203–204. Дададзім, што А.Максімовічу ў Магілёве належала шэсць дамоў: В.И. Мелешко, *Могилев в XVI–середине XVII в.*, с. 163.

[20] Феафан Багдан быў зацверджаны на сваёй пасадзе прывілеем Стэфана Баторыя ад 15 снежня 1576 г.: *АЗР*, т. 3, с. 200–202. Пра яго гл.: T. Śliwa, *Teofan-Bohdan Rypiński – arcybiskup połocki, biskup witebski i mścisławski (1576–1588)*, „Premislia Christiana” 1988–1989, t. 2, s. 227–234. Цікава заўважыць, што ў Баркулабаўскім летапісе, запісаным на мяжы XVI–XVII ст., хутчэй за ўсё, у ася-

і палічыў, што той абвяшчаў аб пажары. Паколькі сам Захарыніч відавочна знаходзіўся па-за межамі манастыра, то туды па яго просьбе накіраваліся шляхцічы Ян Салецкі і Богуш Краскоўскі, магілёўскі дзецкі[21]. Важна адзначыць, што Ян Салецкі з’яўляўся зяцем Сасіна Захарыніча, г.зн. яго жонкай была дачка магілёўскага протапопа Раіна. Як пакажуць пазнейшыя падзеі, шляхціч меў даверaныя стасункі і з самім полацкім уладыкам. Акрамя таго, Ян Салецкі, хіба, амаль пастаянна пражываў у Магілёве і быў даволі заўважнай фігурай на мясцовым узроўні. Так, у сакавіку 1577 г. ён з’яўляўся намеснікам магілёўскага замкавага пісара, якім быў на той момант польны пісар ВКЛ Фронц Жук, а ў маі 1578 г. згадваецца як былы выконваючы абавязкі арандатара мытнай каморы ў Магілёве[22]. У актах Магілёўскага магістрата за 1577–1579 гг. шляхціч выступаў як крэдытор, апякун і давераная асоба мясцовых мяшчан і мяшчанак, а таксама ў якасці сведкі з боку магілёўскага габрэя Ескі Шавуловіча[23]. Таму можна ўпэўнена сцвярджаць, што Салецкі быў добра

---

роддзі праваслаўнага духавенства Аршанскага павета, полацкі ўладыка Феафан Багдан (1576–1588) атрымаў даволі станоўчую ацэнку: згадваецца яго дзейнасць па асвячэнні новых цэркваў, а сам ён ахарактарызаваны, як «*господин благоверный*»: *Беларускія летапісы і хронікі: Пер. са старажытнарускай, старабеларус. і польск.*, уклад. У. Арлова; прадм. В. Чамярыцкага, Мінск 1997, с. 185, 187. Новы падыход да вывучэння гэтага летапісу гл. у: А. Суша, *Баркалабаўскі летапіс ці Баркалабаўскі летапісны спіс?* “Беларускі гістарычны часопіс” 2013, nr 8, с. 5–18.

[21] *АВАК*, т. 39, с. 60; *ИЮМ*, вып. 7, с. 289.

[22] *ИЮМ*, вып. 30, отд. 3, с. 9; вып. 32, ч. 2, с. 168. Ф. Жук з’яўляўся польным пісарам ВКЛ у 1569–1579 гг., пасля чаго зрабіў добрую кар’еру ў Полацкім ваяводстве, трымаючы ўрады полацкага гараднічага (1579–1597), войскага (1592–1598) і земскага суддзі (1598): *Urzędnicy dawnej Rzeczypospolitej XII–XVIII wieku: Spisy*, pod red. A. Gąsiarowskiego, t. 11: *Urzędnicy centralni i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku. Spisy*, oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba, Kórnik 1994, s. 109; *Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: Spisy (UWKL)*, t. 5: *ziemia połocka i województwo połockie XIV–XVIII wiek*, pod red. H. Lulewicza, Warszawa 2018, s. 96, 194, 242.

[23] *АВАК*, т. 39, с. 179–180, 317, 322, 324; *ИЮМ*, вып. 7, с. 291; вып. 30, отд. 3, с. 42–43, 97–99, 135–136.

вядомы ў асяроддзі магілёўскага мяшчанства. Звяртае на сябе ўвагу і месца здарэння. Размешчаны ў Старым горадзе Спаскі манастыр быў адным з буйнейшых праваслаўных манастыроў Магілёва. Так, у сярэдзіне XVI ст. ён валодаў 34 мяшчанскімі сем'ямі. Больш – 37 сем'яў, – належала толькі царкве Святога Міколы[24].

Па версіі абвінавачвання, шляхцічы, калі прыбылі да манастыра, запыталіся ў мяшчан, з якой прычыны тыя абвяшчаюць аб гвалце. Аднак мяшчане, «*наполнившисе воли своее*», з кіямі, каламі і іншай зброяй накінуліся на Яна Салецкага, «*яко невинного человека*», і збілі таго з каня. Па нейкай прычыне гнеў мяшчан быў скіраваны толькі на зяця магілёўскага пратапопа, бо пра Богуша Краскоўскага ў матэрыялах справы больш не згадваецца. Салецкі кінуўся на ўцёкі, ратуючыся за брамай манастыра, што не спыніла раз'юшаных мяшчан: «*Не маючи бачности на местце святое манастырское, моцъно, кгвалтомъ ворота манастырские выбили и выламали*»[25]. Тады шляхціч паспрабаваў схавацца ў асабістым пакоі полацкага архіепіскапа, размешчанага ў тым жа манастыры. Тым не менш, мяшчане выбілі і выламалі дзверы спачатку ў сені, а потым і ў саму святліцу. Схапіўшы шляхціча за горла, яны выцягнулі яго ў двор перад царквой Святога Спаса, дзе працягнулі збіваць. У гэты час у манастыры знаходзілася цяжарная жонка Яна Салецкага. Раіна Салецкая кінулася ратаваць мужа, закрываючы яго сваім целам, але мяшчане «*киими безъ жадного милосердя и литости хрестианское збили и змордовали [Раіну – Ул.П.], яко невесту бременную*»[26]. Жорстка быў збіты, «*передъ церквою у манастыри*», і слуга Салецкіх – Іванка (Іван) Мацвеевіч. На гэтым мяшчане не спыніліся. «*Змордованого а праве на полы умарлого*» Салецкага яны «*отволокли*» не ў магілёўскі замак, «*яко шляхтича*

---

[24] В.И. Мелешко, *Могилев в XVI–середине XVII в.*, с. 161. Дакладную лакалізацыю Спаскай царквы і манастыра, гл. у: І.А. Марзалюк, *Магілёў у XII–XVIII стст.*, с. 26, 28–29.

[25] *АВАК*, т. 39, с. 60; *ИЮМ*, вып. 7, с. 289.

[26] *АВАК*, т. 39, с. 60–61; *ИЮМ*, вып. 7, с. 289–290.

*поцстивого*», абвінавачанага ў нейкім злачынстве, а ў гарадскую турму ў войтаўскім двары[27]. Ужо ў самой турме Аўсей Максімовіч «*пана Яна Солецъского, облупивши и обобравши, нагого за горло на ланцугу завесилъ*»[28]. Супраць мяшчан былі высунуты таксама абвінавачванні ў матэрыяльнай шкодзе. Пасля такога гвалтоўнага ўчынку ў Яна Салецкага нібыта зніклі конь з сядлом, зброя (корд), розныя рэчы і грошы на агульную суму каля 63 коп грошай літоўскіх[29]. А сярод зніклых у час бойкі дакументаў (судовы вырак і сем квітоў на суму ў 222 капы і 28 грошай) быў таксама квіт на чатыры капы доўга ад Арцёма Дуплі – аднаго з непасрэдных удзельнікаў здарэння[30]. Таксама падкрэслівалася, што «*калиту съ поясомъ*», у якой захоўваліся наяўныя грошы, каштоўныя рэчы і квіты, з Яна Салецкага ў гарадской турме зняў «*самъ своими руками*» асабіста Аўсей Максімовіч[31]. У сваю чаргу, у Раіны Салецкай знікла рэчаў, у тым ліку кара́лі і два пярсцёнкі, на суму ў 57 коп і 40 грошай літоўскіх, а ў іх слугі Іванкі прапалі рэчы, грошы і зброя

[27] Паводле прывілея Магілёву на магдэбургскае права, на войтаўства надаваўся дом і дзве валокі «*у стене Дубенецкой*», вольныя ад выплаты ўсякіх падаткаў: *АЗР*, т. 3, с. 204. Ратуша ў горадзе была пабудавана пазней, у XVII ст.: А. Трусаў, *Магілёўская ратуша,* [w:] *Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя*, т. 2, с. 247.

[28] *АВАК*, т. 39, с. 61; *ИЮМ*, вып. 7, с. 290.

[29] Падрабязны пералік шкод, нанесеных Я. Салецкаму, гл.: *АВАК*, т. 39, с. 61; *ИЮМ*, вып. 7, с. 290–291. Дакладную суму яго страт вызначыць цяжка. Так, згадваецца, што ў шляхціча таксама сарвалі з пальца «*сигнетъ золотый, в которомъ было золотыхъ червленыхъ пять*». Аднак не вядома, ці гаворка вялася аб вагавай адзінцы для золата, ці аб кошце сігнета ў залатой манеце, што адпавядала 4 капам і 50 грошам: І. Сінчук, *Чырвоны злоты*, [w:] *Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя*, т. 2, с. 747. У апошнім выпадку, сума стратаў Я. Салецкага складала 62 капы і 46 грошай літоўскіх. Гл. таксама: K. Pęcherzewski, *Mohylew i jego mieszkańcy w latach 1577–1580: w świetle ksiąg magistratu mohylewskiego*, „Czasy Nowożytne” 2007, t. 20, s. 29, 58.

[30] Праўда, выклікае здзіўленне, навошта шляхціч, які ехаў у магчыма ахоплены пажарам раён горада, узяў з сабой столькі важных фінансавых дакументаў.

[31] *АВАК*, т. 39, с. 61; *ИЮМ*, вып. 7, с. 291.

на 6 коп і 10 грошай[32]. Агульная сума матэрыяльных прэтэнзій да мяшчан склала больш за 125 коп грошай літоўскіх.

Відавочна, што пацярпелы бок рабіў націск на некалькіх аспектах здарэння. Падкрэслівалася надзвычайнае месца злачынства, учыненага ў “асвячонай прасторы”[33] манастыра і царквы. Пацярпелыя звярталі ўвагу на прыніжэнне шляхецкага гонару і значныя матэрыяльныя страты. І, канешне, акцэнтавалі сур’ёзнасць фізічнага гвалту. Заяўлялася, што яшчэ не вядома, ці пасля такога збіцця Раіна Салецкая і Іванка Мацвеевіч увогуле выжывуць. Больш за тое, сцвярджалася, што ў выніку пабояў цяжарная жанчына нарадзіла мёртвае дзіця: «*Съ которого бою она дитя неживое породила*»[34].

Па гарачых слядах магілёўскі пратапоп Сасін Захарыніч звярнуўся ў гродскі суд Аршанскага павета з просьбай накіраваць для агляду пацярпелых возната. Гродскі ўрад прызнаў просьбу слушнай і адправіў у Магілёў гаспадарскага возната Іева Захарыніча. Урaднік разам з панятымі («*стороною*»), шляхцічамі Мікалаем Мішкоўскім і Жданам Ілінічам, прыбыў у гарадскую турму, дзе знаходзіўся Ян Салецкі, ды засведчыў вынікі пабояў: «*На немъ раны битые киевые, то есть, на верху головы две раны пробитые, крывавые, подъ окомъ левымъ рана битая синяя, на той же стороне на поличку и на уху раны две ободраные кръвавые, а хрбетъ весь збитъ кийми, раны синии*»[35]. Як можна меркаваць, адразу пасля агляду шляхціч быў вызвалены. Затым Іеў Захарыніч наведаў Раіну Салецкую, «*ле-*

---

[32] *АВАК*, т. 39, с. 61–62; *ИЮМ*, вып. 7, с. 291–292.

[33] Гл. напр.: A. Spicer, *Confessional Space and Identity in Central and Eastern Europe*, [w:] *Formierungen des konfessionellen Raumes in Ostmitteleuropa*, ed. E. Wetter, Stuttgart 2008, p. 340; Ю.Е. Арнаутова, *Погребение. 2. Места захоронений*, [w:] *Словарь средневековой культуры*, с. 367.

[34] *АВАК*, т. 39, с. 61; *ИЮМ*, вып. 7, с. 290.

[35] *АВАК*, т. 39, с. 62; *ИЮМ*, вып. 7, с. 292. Дзейнасць возната рэгламентавалася Статутам ВКЛ 1566 г.: *Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 г.*, [w:] *Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя*, т. 3. *Дадатак*, рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) і інш., Мінск 2010, с. 498–499, 502, 506, 509–510 (раздз. IV, арт. 4–6, 9, 23, 44, 67–69).

*жачую на постели немоцную*», якая паведаміла яму, што ад пабояў у яе заўчасна нарадзілася нежывое дзіця. Агледзеўшы раны, нанесеныя слузе Івану Мацвеевічу, возны адзначыў, што той пасля збіцця «*и теперъ на постели лежитъ и не ведаю, еслижъ будетъ живъ*»[36]. Пацярпелыя, Ян і Раіна Салецкія, а таксама Іван Мацвеевіч, перад возным і панятымі заявілі, што ўсе шкоды ім нанеслі магілёўскія мяшчане, а менавіта Аўсей Максімовіч, Арцём Дупля, браты Марцін і Ярмак Кавалі, Юрка Кулаковіч і Ждан Трысніч[37]. Зразумела, што пасля выхаду са зняволення Салецкі звярнуўся ў войтаўскі суд, патрабуючы пакарання вышэйзгаданых мяшчан за гвалтоўнае збіццё, а таксама за нанесеныя яму, яго жонцы і слузе матэрыяльныя шкоды[38].

## *«Собе покой купуючи»*: палюбоўнае пагадненне

Каралеўскі прывілей 1577 г. вызначаў, што судаводства ў Магілёве павінна было адбывацца выключна паводле норм магдэбургскага права: па ўсіх судовых справах мяшчане «*не иначей, одно правомъ и судомъ немецкимъ будуть повинны становитися и от-*

[36] *АВАК*, т. 39, с. 62; *ИЮМ*, вып. 7, с. 292.

[37] *АВАК*, т. 39, с. 62; *ИЮМ*, вып. 7, с. 292–293. Скарга на мяшчан і рэляцыя markup вознага па просьбе С. Захарыніча былі запісаны ў гродскія кнігі Аршанскага павета. У сваю чаргу, адпаведны выпіс з аршанскіх судовых кніг быў выдадзены асабіста Я. Салецкаму 9 красавіка 1577 г. У выданні пазначана, што гэта адбылося «*у середу*», але тут памылка, паколькі на сераду прыходзілася 10 красавіка 1577 г.

[38] *АВАК*, т. 39, с. 39; *ИЮМ*, вып. 7, с. 282. У час разглядаемых падзей войтам Магілёва з'яўляўся вялікі пісар ВКЛ, віленскі падкаморы і магілёўскі дзяржаўца Мікалай Ясенскі: *АЗР*, т. 3, с. 204; *ИЮМ*, вып. 30, отд. 3, с. 3. Пра М. Ясенскага, які кароткі час у 1582 г. быў нават віленскім войтам, гл.: *Urzędnicy dawnej Rzeczypospolitej XII–XVIII wieku*, t. 11, s. 136; *UWKL*, t. 1: *województwo wileńskie XIV–XVIII wiek*, pod red. A. Rachuby, Warszawa 2004, s. 149, 204. Уласна войтаўства і частковае самакіраванне Магілёву было нададзена яшчэ ў 1561 г.: В.И. Мелешко, *Могилев в XVI–середине XVII в.*, с. 166–171, 173–174.

*поведати*»[39]. Юрыдычную аснову «*суду права Майдеборского*» складалі прававыя зборнікі “Саксонскае Люстра” і “Вейхбільд”. Згодна з іх нормамі, абвінавачаны бок павінен быў, па-першае, кампенсаваць страты, прычым па тым кошце, які вызначылі пацярпелыя. Па-другое, і самае сур’ёзнае, за нанясенне цяжкіх раненняў вінаватым пагражала адсячэнне рукі[40]. Статут ВКЛ 1566 г. таксама прадугледжваў адсячэнне рукі ў якасці пакарання мешчаніну за раненне шляхціча[41]. Паколькі як абвінавачванне, так і пакаранне былі вельмі сур’ёзнымі, то магілёўскія мяшчане схіліліся да вырашэння канфлікту шляхам мірнага пагаднення, а не судовага прысуду. Прычым, паказалі сябе як сапраўдныя прадпрымальнікі – «*покой*» з пацярпелым яны вырашылі купіць. Як пазней адзначаў Аўсей Максімовіч, мяшчане, «*видечи быть на себе не мало шкодъ описаныхъ, и собе дей покой купуючи, у право се не вдаючи его [Яна Салецкага – Ул.П.] поеднали*»[42]. На палюбоўнае вырашэнне канфлікту пагадзіўся і сам шляхціч.

Для вядзення перамоў аб умовах пагаднення бакі абралі сваіх прадстаўнікоў. Гэтыя «*прыятели*» здолелі прывесці ўдзельнікаў бойкі ў вялікодны панядзелак да згоды. У выніку, 5 чэрвеня 1577 г.

---

[39] *АЗР*, т. 3, с. 203–204.

[40] *Саксонское зерцало: Памятник, коммент., исслед. [перевод]*, отв. ред. В.М. Корецкий, Москва 1985, с. 56 (кн. 2, ст. 16, § 2), 98–99 (кн. 3, ст. 47, § 1). Падобная тэндэнцыя адказваць “за рану – рукой” відавочна і ў “Вейхбільдзе”: *Хрестоматия памятников феодального государства и права стран Европы*, под ред. В.М. Корецкого, Москва 1961, с. 390, 391 (ст. 8, 9).

[41] *Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 г.*, с. 529 (раздз. XI, арт. 15). Аб ужыванні ў судаводстве Магілёва як “Саксонскага Люстра”, так і Статута ВКЛ, гл.: О.Б. Келлер, *Распространение и роль «Саксонского Зерцала» в Великом Княжестве Литовском*, [w:] *Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. арт.*: у 2 ч., ч. 2, пад агул. рэд.: Д.У. Дука, У.А. Лобача, А.І. Корсак, Наваполацк 2016, с. 148; В.И. Мелешко, *Могилев в XVI–середине XVII в.*, с. 177, 185–191.

[42] *АВАК*, т. 39, с. 40; *ИЮМ*, вып. 7, с. 283. Прадпрымальнасць з’яўлялася характэрнай якасцю мяшчанства, асабліва купецтва, гл. напр.: А.И. Груша, *Традиция и её преодоление: Русь и Великое Княжество Литовское в XII–первой трети XVI в.*, Вильнюс 2024, с. 174.

Ян Салецкі і магілёўскія мяшчане заключылі «*вечъное еднанъе*»[43], паводле якога абодва бакі пад пагрозай вызначаных штрафаў «*вечными часы*» абяцалі больш не працягваць судовае разбіральніцтва па дадзенай справе, а шляхціч атрымліваў грашовую кампенсацыю. Звесткі аб яе памеры ў захаваных матэрыялах супярэчлівыя. Так, Аўсей Максімовіч заяўляў, што за сябе і за ўсіх іншых мяшчан заплаціў Яну Салецкаму 23 капы грошай літоўскіх. Затое Арцём Дупля і Марцін Каваль даводзілі, што мяшчане выплацілі шляхцічу 30 коп грошай, з якіх Дупля заплаціў сем коп, а Каваль – восем коп[44]. Як бы там ні было, звяртае на сябе ўвагу тое, што сума кампенсацыі, на якую пагадзіўся пацярпелы бок (мяркуем, яна тычылася не толькі Яна Салецкага, але і яго жонкі ды слугі), была ў некалькі разоў меншай за першапачаткова заяўленую суму нанесеных шкодаў. Гэта прымушае паставіць пытанне пра адпаведнасць абвінавачванняў рэальным маштабам гвалту. Ствараецца ўражанне, што Захарыніч і Салецкі свядома завышалі памеры матэрыяльных, а можа і маральных, страт, каб аказаць адпаведны эфект на судовых ураднікаў у Магілёве і Оршы, паказаць сваіх апанентаў у максімальна негатыўным святле, прэтэндаваць на большую кампенсацыю ды мець больш моцныя пазіцыі ў час судовых слуханняў. Падаецца, перад намі прыклад "рытарычных клішэ" ў апісанні гвалту, якія ў значнай ступені мелі сімвалічны характар і вызначаліся культурнымі нормамі тагачаснага грамадства[45].

[43] *АВАК*, т. 39, с. 40; *ИЮМ*, вып. 7, с. 283–284. Тэкст гэтай дамовы не захаваўся. Яе змест вядомы толькі з кароткага пераказу ў адным з актаў Магілёўскага магістрата са жніўня 1578 г.

[44] *АВАК*, т. 39, с. 39, 40, 56; *ИЮМ*, вып. 7, с. 282, 283, 286. Для параўнання, у 1577 г. дом з гаспадарчымі пабудовамі і пляцам у 4,75 пруты па вуліцы Шклоўскай, адной з галоўных вуліц горада, быў прададзены за 12 коп грошай, а дом з рознымі пабудовамі і пляцам у 4 пруты ў даволі прэстыжным Пакроўскім пасадзе – нават за 17 коп грошай літоўскіх: *ИЮМ*, вып. 32, ч. 1, с. 204–206, 207. Аб сацыяльнай тапаграфіі Магілёва, развіцці і прэстыжнасці гарадскіх пасадаў у XVI ст., гл.: І.А. Марзалюк, *Магілёў у XII–XVIII стст.*, с. 22–34.

[45] Гэты феномен яскрава паказала ўкраінская даследчыцца Наталля Старчанка пры даследаванні канфліктаў у асяроддзі шляхты Валынскага ваяводства другой

А вось для мяшчан, на наш погляд, канфлікт меў выключны характар. Ступень гвалту з іх боку, хіба, выйшла па-за агульнапрынятыя межы. Яны гэта разумелі і падкрэслівалі, што пайшлі на пагадненне з пацярпелым шляхцічам, «*видечи быть на себе великую тяжкость*». Паказальна, што ў жніўні 1578 г., ледзьве не праз паўтары гады пасля падзей у манастыры, нават некаторыя непасрэдныя іх удзельнікі ўсё яшчэ спрабавалі знайсці вінаватага ў тым, што канфлікт набыў такі гвалтоўны характар: «*Якоже дей и теперъ ищемъ вспосродъ себе винного, который бы былъ причиною того бою и кгвалту на Солецъского*»[46]. У склаўшайся сітуацыі, палюбоўнае пагадненне было выгодна абодвум бакам. Канфлікт спыняўся, абвінавачаныя не мусілі несці пакаранне, а пацярпелыя атрымлівалі кампенсацыю. Не патрэбна было выдаткоўваць сродкі на вядзенне судовага працэсу, усе захоўвалі свой гонар, а гарадская супольнасць утрымлівала раўнавагу[47]. На жаль, не вядомы імёны палюбоўных суддзяў, што магло б дапамагчы адлюстраваць нефармальныя механізмы залагоджвання канфліктаў, а таксама выявіць разнастайныя сувязі сярод жыхароў горада.

## «*Чомужъ правомъ первей не чинили*»: новыя аблічча канфлікту

Заключанае пагадненне, аднак, не паставіла кропку ў падзеях, звязаных з бойкай у Спаскім манастыры. Па-першае, менавіта пасля дасягнення кампрамісу з Янам Салецкім канфлікт разгарэўся

паловы XVI–пачатку XVII ст.: Н. Старченко, *Честь, кров і риторика. Конфлікт у шляхетському середовищі Волині (друга половина XVI–XVII століття)*, Київ 2014, с. 21, 40–45, 320–321; *Стратегії та ритуали конфлікту: шляхетський соціум Волині зламу XVI і XVII ст. Джерела та інтерпретації*, упорядник Н.П. Старченко; відп. ред. Г.В. Боряк, Київ 2020, с. 6–14, 39–41.

[46] *АВАК*, т. 39, с. 40, 59; *ИЮМ*, вып. 7, с. 284, 287.

[47] Н. Старченко, *Честь, кров і риторика*, с. 373–408; *Стратегії та ритуали конфлікту*, с. 12–13, 62–71.

ўжо паміж самімі мяшчанамі, якія да гэтага дзейнічалі салідарна. Праз месяц, у ліпені 1577 г., Арцём Дупля і Марцін Каваль скардзіліся на Аўсея Максімовіча, што той асабіста вярнуў Яну Салецкаму рэчы, зніклыя ў шляхціча пад час бойкі, а значыць яны не павінны былі несці за іх матэрыяльную адказнасць[48]. У сваю чаргу, як можна зразумець з матэрыялаў справы, Максімовіч абвінаваціў Дуплю і Каваля ў тым, што яны не выканалі ўмоў заключанага з Салецкім пагаднення. У выніку, Арцём Дупля і Марцін Каваль былі арыштаваны прадстаўнікамі магістрата і адсядзелі ў гарадской турме 17 тыдняў «*за бой шляхетский*»[49].

Улетку 1578 г. абодва зноў звярнуліся ў суд, каб давесці сваю невінаватасць. Спачатку, у ліпені таго года, на магістрат і яго службоўцаў скардзіўся Марцін Каваль. Ён заявіў, што быў кінуты ў вязніцу незаконна. Да таго ж, пад час арышту ў яго забралі розных рэчаў на суму ў дзве капы і 50 грошай, а яго брат Ярмак нібыта быў нават паранены тым самым Янам Салецкім. Аднак гэтая скарга не мела сваіх вынікаў. У адказ на абвінавачанне ў рабунку, Ждан Лапата, які ў 1577 г. быў магілёўскім лаўнікам, яшчэ раз падкрэсліў, што рэчы былі канфіскаваны, паколькі Каваль «*остал былъ виненъ п(а)ну Солецъкому, еднаючи его о бой, которы дей был се сталъ кгвалтъ у манастыра Светого Спаса*»[50]. Тады ў жніўні 1578 г. Марцін Каваль ужо разам з Арцёмам Дупляй абвінавацілі Аўсея Максімовіча, што менавіта той быў галоўным завадатарам падзей у Спаскім манастыры, а яны без усякай віны апынуліся ў турме. Дупля і Каваль патрабавалі ад Максімовіча кампенсацыі сваіх стратаў, якія панеслі за час адбыцця пакарання, але паколькі тэрмін даўнасці па разглядапай справе ўжо закончыўся, а бок абвінавачвання не прывёў нейкіх

---

[48] *АВАК*, т. 39, с. 39, 46; *ИЮМ*, вып. 7, с. 282, 285.

[49] *АВАК*, т. 39, с. 3, 49; *ИЮМ*, вып. 7, с. 282–283, 286. Хутчэй за ўсё, адбывалі пакаранне ў жніўні–лістападзе 1577 г.

[50] *АВАК*, т. 39, с. 3, 15, 22–23. Гл. таксама: K. Pęcherzewski, *Mohylew i jego mieszkańcy w latach 1577–1580*, s. 29.

новых прававых аргументаў, то справа была закрыта[51]. А ўжо ў верасні сам Аўсей Максімовіч абвінаваціў Арцёма Дуплю, Марціна Каваля, Ярмолу Мікалаевіча і Юрку Лукашэвіча ў тым, што тыя да гэтага часу не вярнулі яму грошы, якія ён заплаціў за іх, выконваючы ўмовы палюбоўнага пагаднення з Янам Салецкім. Адказчыкі заяўлялі, што яны ніякіх грошай Максімовічу не павінны, кампенсацыю пацярпеламу шляхцічу выплацілі асабіста, а на пацвярджэнне сваіх слоў былі гатовы прысягнуць. Прынясенне прысягі было прызначна на 17 верасня 1578 г. У гэты дзень бакі сабраліся ў магістраце, але адразу абвясцілі, што заключылі паміж сабой пагадненне і дасягнулі згоды: «*уходечи присеги, межи собою погодилисе, и вжо о тое один другог(о) до права поволокать не мает вечными ч(а)сы*»[52].

Працяг канфлікту ўжо сярод мяшчан дае магчымасць заўважыць характэрныя для мяшчанскага асяроддзя элементы свядомасці, каштоўнасці, вобразы і мадэі паводзін. Гэтая спрэчка выразна паказала, што саслоўная салідарнасць[53], якая выявілася ў час канфлікту з прадстаўнікамі шляхты і духавенства, адразу была разбурана, як толькі непаразуменні ўзніклі ў межах самой мяшчанскай супольнасці. Мяркуем, што гэтыя супярэчнасці паглыблялі не толькі фінансавыя прэтэнзіі, але і той факт, што Аўсей Максімовіч прадстаўляў гарадскую эліту, а астатнія ўдзельнікі канфлікту відавочна належалі да паспольства, асноўнай масы магілёўскіх гараджан. Скарга Марціна Каваля «*на всю раду места Могилевского [...] о невинное саженье до везенья*» таксама наводзіць на думку аб адчуванні простым рамеснікам несправядлівасці з боку вышэйшых ураднікаў горада. Звернем асаблівую ўвагу, што менавіта ў гэты час сярэдняе і дробнае мяшчанства Магілёва імкнулася дабіцца большага ўплыву на дзейнасць магістрата, у якім безумоўную перавагу мела

---

[51] *АВАК*, т. 39, с. 39–40, 41, 45, 46, 49; *ИЮМ*, вып. 7, с. 282–286.

[52] *АВАК*, т. 39, с. 40, 56, 59, 64, 70; *ИЮМ*, вып. 7, с. 283, 286–288.

[53] Аб саслоўнай салідарнасці і гарадскім патрыятызме магілёўскага мяшчанства гл.: І.А. Марзалюк, *Магілёў у XII–XVIII стст.*, с. 83–85.

заможная вярхушка гараджан[54]. Канфлікт 1578 г. быў вырашаны палюбоўна, у пазасудовым парадку, а гарадскі суд зноў быў выкарыстаны для легітымізацыі пазіцыі бакоў[55]. Нарэшце, разбіральніцтва адлюстравала, наколькі важнае месца ў сістэме каштоўнасцяў мяшчанства займала іх прафесійная дзейнасць. Так, Арцём Дупля патрабаваў кампенсацыі не толькі за свае выдаткі на ўтрыманне ў турме або за сапсаваны за гэты час тавар, але і за страты ад вымушанага перапынку ў гандлі. За час адбыцця пакарання ён прапусціў некалькі «*ближнихъ ярмарковъ*», што, па яго ацэнках, прынесла стратаў на 30 коп грошай[56]. Для мешчаніна час актыўнай камерцыйнай дзейнасці меў канкрэтнае грашовае вымярэнне.

Па-другое, у снежні 1577 г. ужо полацкі ўладыка Феафан Багдан падаў скаргу на магілёўскіх мяшчан аб пашкоджанні манастырскай маёмасці ў час падзей у вялікодны панядзелак. Паводле скаргі, якую ў судзе ад імя ўладыкі прадставілі Ян Салецкі і Януш Длускі, 8 красавіка 1577 г. Аўсей Максімовіч, Арцём Дупля, Марцін і Ярмак Кавалі, Юрка Кулаковіч і Ждан Трысніч, «*наполнившися воли своей*», у манастыры Святога Спаса «*ворота выбили, до сеней, светлицъ двери повыбывали, окна и печи побили, у коморы замок збили, защепки поломали*». Феафан Багдан прасіў «*з них, яко з кгвалтовников, о вчинене справедливости скутечнои а не отволочное*»[57]. У адказ абвінавачаныя мяшчане заявілі, што такіх шко-

[54] Вынікам гэтай барацьбы стала стварэнне ў 1580 г. кантрольна-дарадчага органа пры магістраце, які складаўся з 12 “паспалітых” і прадстаўляў сярэдняе мяшчанства Магілёва: В.И. Мелешко, *Могилев в XVI–середине XVII в.*, с. 177–182.

[55] Параўнай: Н. Старченко, *Честь, кров і риторика*, с. 319; *Стратегії та ритуали конфлікту*, с. 12.

[56] *ИЮМ*, вып. 7, с. 282–283. Паводле ўласных падлікаў, за 17 тыдняў А. Дупля выдаткаваў на сваё ўтрыманне ў турме 15 коп грошай, а М. Каваль – 10 коп. Акрамя таго, у А. Дуплі за гэты час «*вытекло съ пети бочокъ горелки*» на 30 коп і 50 грошай, а таксама згніло рыбы на 23 капы і 15 грошай. На стаўленне магілёўскіх мяшчан да працы, як да каштоўнасці, увага ўжо звярталася: І.А. Марзалюк, *Магілёў у XII–XVIII стст.*, с. 88–90.

[57] Справа разглядалася 7 і 9 снежня 1577 г.: *ИЮМ*, вып. 32, ч. 1, с. 221–222. Заўважым, што 5 і 7 снежня 1577 г. у магілёўскім магістраце разбіралася справа

даў манастырскай маёмасці не рабілі і выказалі гатоўнасць прынесці на гэта прысягу. У вызначаны для прынясення прысягі дзень у магістрат прыбылі прадстаўнікі полацкага ўладыкі і мяшчане са сваімі даверанымі асобамі. Да прадстаўнікоў Феафана Багдана, які па нейкіх пільных справах на той час з'ехаў з Магілёва, далучыўся таксама цівун і гараднічы трокскі Марцін Стравінскі[58]. І калі ўжо магілёўскія мяшчане былі гатовы прысягнуць на сваю невінаватасць, давераныя асобы архіепіскапа абвясцілі іх вольнымі ад абвінавачванняў: «*Нижли их милость панове до присеги не вели и за моцъю от его милости отца владыки, им злецоною, их и кождого в той речи обвиненого именемъ его милости вольными вчинили*»[59]. На нашу думку, гэты кароткі працэс быў напоўнены глыбокім сімвалізмам. Уладыка, які відаць разумеў, што абвінавачванні ў шкодзе манастырскай маёмасці не пацвердзяцца, усё роўна звярнуўся ў суд з мэтай яшчэ раз падкрэсліць цяжар учынку мяшчан на асвячонай тэрыторыі манастыра і царквы. Мяшчане, упэўненыя ў сваёй невінаватасці, адразу звярнуліся да выключнага доказу – прысягі[60]. Давераныя асобы Феафана Багдана безумоўна загадзя былі гатовы вызваліць адказчыкаў ад прынясення прысягі, але зрабілі гэта ў самы апошні момант. Такое вызваленне ад прысягі выглядае сімвалічным учынакам, які не толькі паказваў велікадушнасць і міласэрнасць уладыкі, але і мог падкрэсліваць першынство духавенства перад мяшчанствам.

---

аб выплаце Я. Салецкаму 4 коп грошай, якія ён пазычыў А. Дуплі. Шляхціч заяўляў, што мешчанін не даплаціў яму з гэтай сумы 70 грошай, але ў выніку пагадзіўся на вяртанне сабе толькі 20 грошай: Там же, с. 220–221.

[58] М. Стравінскі ўжо ў 1579 г. стане новым войтам Магілёва. Аб яго кар'еры, у час якой ён дасягнуў сенатарскіх урадаў менскага (1590–1592) і віцебскага (1592–1594) кашталянаў, гл.: H. Lulewicz, *Strawiński Marcin h. Sulima (zm. 1594)*, [w:] *Polski słownik biograficzny*, t. 44, z. 181, Warszawa–Kraków 2006, s. 288–290.

[59] *ИЮМ*, вып. 32, ч. 1, с. 222.

[60] Аб інстытуце прысягі ў ВКЛ XV–XVI ст. гл. напр.: А.И. Груша, *Кризис доверия? Появление и утверждение правового документа в Великом Княжестве Литовском (конец XIV–первая треть XVI в.)*, Москва; СПб. 2019, с. 152–169; Он же. *Традиция и её преодоление*, с. 78–79.

## Прычыны падзей красавіка 1577 г.

Нарэшце, паспрабуем акрэсліць *магчымыя* прычыны тых гвалтоўных падзей, якія адбыліся ў Магілёве 8 красавіка 1577 г. Адразу паставім пад сумненне версію абвінавачвання ў тым, што бойка ў манастыры Святога Спаса стала вынікам нейкага канфлікту ў асяроддзі саміх мяшчан, які пачаўся яшчэ ў карчме. Хутчэй наадварот, у час святочнай "бяседы" прынамсі частка гараджан прыняла рашэнне накіравацца ў манастыр. На яго тэрыторыі і пэўны час пасля мяшчане відавочна дзейнічалі салідарна. Іх агрэсія была звернута не супраць нейкай іншай групы рамесна-купецкага насельніцтва Магілёва, а супраць канкрэтнага шляхціча, дарэчы, цесна звязанага з вышэйшым мясцовым духавенствам. Пры гэтым, варта памятаць, што ў даіндустрыяльным грамадстве гарадскія святы не толькі адлюстроўвалі, але і ўзмацнялі пачуццё сацыяльнай еднасці мяшчанства[61]. Разгляданы выпадак паказвае, што карчма выконвала не толькі забаўляльную функцыю або функцыю грамадскага харчавання, але і стала месцам прыняцця калектыўнага рашэння. З улікам усяго гэтага, паход з карчмы ў манастыр і па-сутнасці яго захоп мусіў мець нейкія больш глыбінныя матывы і прычыны. Аб тым, што гэта не быў просты прыватны канфлікт сведчыць і збор Аўсеем Максімовічам грошай на кампенсацыю Яну Салецкаму з усяго горада, г.зн. мяшчане разглядалі дадзеную справу як агульную для сваёй супольнасці: «*Ижъ дей Овсей уси гроши до себе бралъ, которые **зо всего места выбиралъ** [падкрэслена – Ул.П.] на плачене пану Солецъскому*»[62]. Важнае і сімвалічнае значэнне мела таксама месца канфлікту. Размешчаная ў манастырскім комплексе Спаская царква з'яўлялася самай старажытнай у горадзе, лічылася яго патронам і ў канцы XVI ст. мела статус «*головной*» царквы Магілёва[63].

---

[61] С.И. Лучицкая, *Праздник*, [w:] *Словарь средневековой культуры*, с. 390, 392. Аб гарадскіх святах у Магілёве гл.: І.А. Марзалюк, *Магілёў у XII–XVIII стст.*, с. 113–119.

[62] *ИЮМ*, вып. 7, с. 287.

[63] Ф. Жудро, *История Могилевского Богоявленского братства*, с. 7, 18–20.

У гістарыяграфіі ўжо выказвалася меркаванне, што канфлікт 1577 г. быў адным з эпізодаў барацьбы магілёўскага мяшчанства з мясцовым праваслаўным духавенствам за права патранату над гарадскімі цэрквамі[64]. Матэрыялы дадзенай справы непасрэдна не называюць такой прычыны разгляданых падзей, але сам кантэкст, у якім яны разгортваліся, дазваляюць прызнаць слушнасць гэтай версіі. Барацьба паміж мяшчанамі і духавенствам за кантроль над царкоўнымі справамі была несумненным фактарам сацыяльна-палітычнага жыцця Магілёва канца XVI–пачатку XVII ст.[65] Яшчэ раз падкрэслім, што захоп 8 красавіка 1577 г. Спаскага манастыра не быў прыватнай справай нейкай групы гараджан, а ўспрымаўся як справа ўсіх магілёўскіх мяшчан. Як ужо адзначалася, гэтая абіцель была адной з найбагацейшых у Магілёве. Аднак кантроль над галоўным манастыром горада, які знаходзіўся ў найбольш прэстыжнай яго частцы, быў важны не толькі з матэрыяльнага, але і з сімвалічнага пункту гледжання[66]. Гэта выразна адлюстроўвала б статус мяшчанства ў параўнанні з іншымі групамі гарадской супольнасці Магілёва. Неабходна ўзяць пад увагу і прызначэнне ў снежні 1576 г. новага архіепіскапа полацкага, віцебскага і мсціслаўскага Феафана Багдана. У сувязі з акупацыяй Полацка, адной з асноўных яго рэзідэнцый стаў Магілёў[67].

З'яўленне ў горадзе новага ўладыкі магло зноў абвастрыць супярэчнасці паміж мяшчанствам і духавенствам. Абодвум бакам неабходна было паказаць, хто з'яўляецца гаспадаром магілёўскіх сакральных аб'ектаў. Ускосна аб такім характары канфлікту сведчаць, на нашу думку, і паводзіны 8 красавіка 1577 г. Сасіна Захарыніча,

---

[64] Аднак без належнай аргументацыі: Ф. Жудро, *История Могилевского Богоявленского братства*, с. 8–9; І.А. Марзалюк, *Магілёў у XII–XVIII стст.*, с. 94.

[65] *ИЮМ*, вып. 7, с. 496–498; Ф. Жудро, *История Могилевского Богоявленского братства*, с. 8–9; 20–22; І.А. Марзалюк, *Магілёў у XII–XVIII стст.*, с. 93–96.

[66] Гл. напр.: A. Spicer, *Confessional Space and Identity in Central and Eastern Europe*, p. 341.

[67] У 1578 г. полацкі ўладыка сам паведамляў манарху, што Магілёў знаходзіцца «*въ краю томъ, где онъ наибольшей перемешкиваетъ*»: *АЗР*, т. 3, с. 222.

які з’яўляўся трымальнікам Спаскага манастыра і нёс за яго адказнасць. Замест таго, каб асабіста накіравацца ў манастыр, дзе адбываліся нейкія надзвычайныя падзеі, можа нават пажар, магілёўскі пратапоп папрасіў адправіцца туды двух шляхцічаў. Мяркуем, што і гвалтоўныя дзеянні мяшчан, якія ў пэўны момант выйшлі па-за агульнапрынятыя межы, былі выкліканы тым, што Ян Салецкі і яго жонка Раіна (нагадаем, дачка пратапопа) у іх вачах непасрэдна атаясамліваліся з мясцовым духавенствам. Захарыніч, хіба, разумеў, што ў той дзень яму не варта было трапляцца на вочы раз’юшаным гараджанам. Падаецца, у гэтым ключы варта разумець і позаў Феафана Багдана супраць мяшчан у снежні 1577 г. Абвінавачванне ў значных матэрыяльных шкодах манастырскай маёмасці, а затым, перад самай прысягай, велікадушнае іх прабачэнне з боку ўладыкі мусіла паказаць, хто ў рэчаіснасці мае першынство ў адносінах “духавенства–мяшчанства”.

У лютым 1578 г. на вальным сойме Рэчы Паспалітай Стэфан Баторый выдаў прывілей, паводле якога царква і манастыр Святога Спаса ў Магілёве перадаваліся пад уладу полацкага архіепіскапа Феафана Багдана[68]. Дапускаем, што пэўную ролю ў гэтым рашэнні манарха мог адыграць і канфлікт 1577 г. Аднак перамога духавенства была кароткатэрміновай. У 1585 г. магілёўскія гараджане скардзіліся Стэфану Баторыю, што царква Святога Спаса, «*которая дей есть ихъ властнымъ накладомъ збудована и въ ихъ моцы и подаванью передъ тымъ дей завжды бывала*», за час яе трымання полацкім уладыкам прыйшла ў заняпад. Сам Феафан Багдан у Магілёве не з’яўляўся, а яго намеснік занядбаў духоўныя і царкоўныя справы ды «*только пожитковъ своихъ, а не хвалы Божой стережетъ*». У выніку, у сакавіку 1585 г. Стэфан Баторый выдаў новую грамату, паводле якой Спаская царква зноў пераходзіла ў падпарад-

---

[68] *АЗР*, т. 3, с. 222–223. Аб сойме 1578 г. гл.: *Volumina Constitutionum*, t. II (*1550–1609*), vol. 1 (*1550–1585*), do druku przygotowali S. Grodziski, I. Dwornicka i W. Uruszczak, Warszawa 2005, s. 404–430.

каванне магілёўскім мяшчанам[69]. А ўжо ў чэрвені 1588 г. новы кароль і вялікі князь Жыгімонт Ваза перадаў ім і сам манастыр Святога Спаса з усёй яго маёмасцю[70].

## Высновы

Такім чынам, разгледжаны канфлікт выявіў наяўнасць у межах гарадской супольнасці Магілёва цесных сувязяў паміж прадстаўнікамі розных саслоўяў і сацыяльных груп. Мяшчан, духавенства і шляхту злучаў цэлы комплекс камерцыйных, адміністрацыйных, судовых і нават сваяцкіх адносін. У падобнай сацыяльнай прасторы таксама існавалі і свае супярэчнасці, якія маглі прыводзіць да гвалтоўных учынкаў. На нашу думку, галоўнай прычынай падзей у манастыры Святога Спаса 8 красавіка 1577 г. стала барацьба паміж мяшчанамі і праваслаўным духавенствам за права патранату над цэрквамі горада, а ступень гвалту адлюстравала выстрыню гэтай барацьбы. І хоць ахвярай гвалту з боку мяшчан стаў шляхціч са сваімі жонкай і слугой, але іх сувязь са святарствам была непасрэднай. Дарэчы, у дадзеным канкрэтным выпадку мясцовае праваслаўнае духавенства карысталася відавочнай падтрымкай з боку шляхты. Мяшчане, у сваю чаргу, у пачатку канфлікту выступалі салідарна, але па меры развіцця падзей паміж імі пачаліся непаразуменні, выкліканыя, відаць па ўсім, іх розным сацыяльным статусам і маёмасным становішчам. Разбіральніцтва вакол гвалту, учыненага ў манастыры, выразна паказала як цесна ў грамадстве таго часу перапляталіся

[69] *АЗР*, т. 3, с. 296. Пасля вызвалення ў жніўні 1579 г. Полацка войскам Рэчы Паспалітай менавіта гэты горад стаў галоўнай рэзідэнцыяй уладыкі Феафана Багдана.

[70] Праўда, з-за спрэчкі з новым архіепіскапам полацкім, віцебскім і мсціслаўскім Афанасіем Цярлецкім (1588–1592) узяць Спаскі манастыр пад сваю ўладу – «*въ справу, въ заведанье и въ подаванье*», – мяшчане Магілёва змаглі толькі ўвесну 1590 г.: *АЗР*, т. 4 (*1588–1632*), СПб. 1851, с. 7–9, 31–32; T. Śliwa, *Teofan-Bohdan Rypiński,* s. 231–232; Ф. Жудро, *История Могилевского Богоявленского братства*, с. 9.

судовыя і пазасудовыя механізмы вырашэння канфліктаў. Прычым, абодва шляхі адыгрывалі вельмі важную ролю. У афіцыйныя суды бакі звярталіся з мэтай фіксацыі, абгрунтавання і прававога прызнання сваёй пазіцыі. Аднак залагоджванне самых прынцыповых супярэчнасцяў, дасягненне згоды і заключэнне выгаднага ўсім пагаднення адбывалася праз палюбоўныя суды. Можна сцвярджаць, што інстытут палюбоўнага суда быў адным з важнейшых фактараў, які забяспечваў стабільнае існаванне гарадской супольнасці. Неабходна звярнуць увагу на сімвалічнае напаўненне дзеянняў удзельнікаў канфлікту. Так, перабольшаныя абвінавачванні, зварот да эмацыйных вобразаў (напрыклад, гвалт у асвячонай прасторы манастыра), "велікадушнае" прабачэнне абвінавачваемых і іншыя падобныя дзеянні відавочна апелявалі да ментальных установак і калектыўных уяўленняў тагачаснага насельніцтва. Таксама як і некаторыя ўчынкі мяшчан сведчылі аб іх карпаратыўнай салідарнасці, прадпрымальнасці, стаўленні да працы, як да каштоўнасці, ці аб усё яшчэ значнай павазе да інстытуту прысягі. Лічым, што далейшы аналіз падобных выбраных выпадкаў паспрыяе больш грунтоўнаму вывучэнню сацыяльных сувязяў і культурных асаблівасцяў, уласцівых насельніцтву гарадоў Вялікага Княства Літоўскага ў перыяд ранняга Новага часу.

## Bibliografia

### Źródła

*Akty, izdavaemye Vilenskoj arheografičeskojkomissiej: v 39 t., t. 39: Akty Mogilevskogo magistrata XVI v. (1578–1580 gg.),* Vil'na 1915 [*Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией*: в 39 т., т. 39: *Акты Могилевского магистрата XVI в. (1578–1580 гг.)*, Вильна 1915].

*Akty, otnosâŝiesâ k istorii Zapadnoj Rossii,sobrannye i izdannye arheografičeskoj komissiej:* v 5 t., t. 3 (1544–1587), SPb. 1848 [*Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные археографической комиссией*: в 5 т., т. 3 (1544–1587), СПб. 1848].

*Akty, otnosâŝiesâ k istorii Zapadnoj Rossii,sobrannye i izdannye arheografičeskoj komissiej:* v 5 t., t. 4 (1588 - 1632), SPb. 1851 [*Акты, относящиеся к исто-*

*рии Западной России, собранные и изданные археографической комиссией*: в 5 т., т. 4 (*1588–1632*), СПб. 1851].

*Belaruskìâ letapìsy ì hronìkì: Per. sastaražytnaruskaj, starabelarus. ì pol'sk.*, uklad. U. Arlova; pradm.V. Čamâryckaga, Mìnsk 1997 [*Беларускія летапісы і хронікі: Пер. са старажытнарускай, старабеларус. і польск.*, уклад. У. Арлова; прадм. В. Чамярыцкага, Мінск 1997].

*Hrestomatiâ pamâtnikov feodal'nogo gosudarstva iprava stran Evropy,* pod red. V.M. Koreckogo, Moskva 1961 [*Хрестоматия памятников феодального государства и права стран Европы*, под ред. В.М. Корецкого, Москва 1961].

*Istoriko-ûridičeskie materialy, izvlečennye izaktovyh knig gubernij Vitebskoj i Mogilevskoj:* v 32 vyp., vyp. 7, Vitebsk 1876 [*Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской*: в 32 вып., вып. 7, Витебск 1876].

*Istoriko-ûridičeskie materialy, izvlečennye izaktovyh knig gubernij Vitebskoj i Mogilevskoj:* v 32 vyp., vyp. 8, Vitebsk 1877 [*Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской*: в 32 вып., вып. 8, Витебск 1877].

*Istoriko-ûridičeskie materialy, izvlečennye izaktovyh knig gubernij Vitebskoj i Mogilevskoj:* v 32 vyp., vyp. 30, Vitebsk 1903 [*Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской*: в 32 вып., вып. 30, Витебск 1903].

*Istoriko-ûridičeskie materialy, izvlečennye izaktovyh knig gubernij Vitebskoj i Mogilevskoj:* v 32 vyp., vyp. 32, Vitebsk 1906 [*Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской*: в 32 вып., вып. 32, Витебск 1906].

*Saksonskoe zercalo: Pamâtnik, komment., issled.[perevod],* otv. red. V.M. Koreckij, Moskva 1985 [*Саксонское зерцало: Памятник, коммент., исслед. [перевод]*, отв. ред. В.М. Корецкий, Москва 1985].

*Statut Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga 1566 g., [w:] Vâlìkae Knâstva Lìtoŭskae: Èncyklapedyâ, t. 3. Dadatak,* rèdkal.: T.U. Bâlova (gal. rèd.) ì ìnš., Mìnsk 2010, s. 467–550 [*Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 г.*, [w:] *Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя*, т. 3. *Дадатак*, рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) і інш., Мінск 2010, с. 467–550].

*Urzędnicy dawnej Rzeczypospolitej XII–XVIII wieku: Spisy*, pod red. A. Gąsiarowskiego, t. 11: *Urzędnicy centralni i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku. Spisy*, oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba, Kórnik 1994.

*Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: Spisy*, t. 1: *województwo wileńskie XIV–XVIII wiek*, pod red. A. Rachuby, Warszawa 2004.

*Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: Spisy*, t. 5: *Ziemia połocka i województwo połockie XIV–XVIII wiek*, pod red. H. Lulewicza, Warszawa 2018.

*Volumina Constitutionum*, t. II (*1550–1609*), vol. 1 (*1550–1585*), do druku przygotowali S. Grodziski, I. Dwornicka i W. Uruszczak, Warszawa 2005.

## Opracowania

Arnautova Û.E., *Pogrebenie. 2. Mestazahoronenij*, [w:] *Slovar' srednevekovoj kul'tury*, pod obŝ. red. A.Â. Gureviča, Moskva 2003, s. 364–369 [Арнаутова Ю.Е., *Погребение. 2. Места захоронений*, [w:] *Словарь средневековой культуры*, под общ. ред. А.Я. Гуревича, Москва 2003, с. 364–369].

Âstrebickaâ A.L., *Gorod,* [w:] *Slovar' srednevekovojkul'tury,* pod obŝ. red. A.Â. Gureviča, Moskva 2003, s. 113–120 [Ястребицкая А.Л., *Город*, [w:] *Словарь средневековой культуры*, под общ. ред. А.Я. Гуревича, Москва 2003, с. 113–120].

Doŭnar-Zapol'skì M.V., *Dzâržaйnaâ Gaspadarkavâlìkaga knâstva Lìtoŭskaga pry Âgelonah,* padryht. da druku: A.Ì. Gruša,R.A. Alâhnovìč, Mìnsk 2009 [Доўнар-Запольскі М.В., *Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах*, падрыхт. да друку: А.І. Груша, Р.А. Аляхновіч, Мінск 2009].

Gruša A.I., *Krizis doveriâ? Poâvlenie iutverždenie pravovogo dokumenta v Velikom Knâžestve Litovskom (konec XIV–pervaâ tret' XVI v.),* Moskva; SPb. 2019 [Груша А.И., *Кризис доверия? Появление и утверждение правового документа в Великом Княжестве Литовском (конец XIV–первая треть XVI в.)*, Москва; СПб. 2019].

Gruša A.I., *Tradiciâi eë preodolenie: Rus' i Velikoe Knâžestvo Litovskoe v XII–pervoj treti XVI v.,* Vil'nûs 2024 [Груша А.И., *Традиция и её преодоление: Русь и Великое Княжество Литовское в XII–первой трети XVI в.*, Вильнюс 2024].

Keller O.B., *Rasprostranenie i rol'«Saksonskogo Zercala» v Velikom Knâžestve Litovskom,* [w:] *Belaruskae Padzvìnne: vopyt, metodyka ìvynìkì palâvyh ì mìždyscyplìnarnyh dasledavannâŭ:* zb. navuk. art.: u 2 č., č. 2, padagul. rèd.: D.U. Duka, U.A. Lobača, A.Ì. Korsak, Navapolack 2016, s. 142-151 [Келлер О.Б., *Распространение и роль «Саксонского Зерцала» в Великом Княжестве Литовском*, [w:] *Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. арт.*: у 2 ч., ч. 2, пад агул. рэд.: Д.У. Дука, У.А. Лобача, А.І. Корсак, Наваполацк 2016, с. 142–151].

Lučickaâ S.I., *Prazdnik,* [w:] *Slovar' srednevekovojkul'tury,* pod obŝ. red. A.Â. Gureviča, Moskva 2003, s. 386–393 [Лучицкая С.И., *Праздник*, [w:] *Словарь средневековой культуры*, под общ. ред. А.Я. Гуревича, Москва 2003, с. 386–393].

Lulewicz H., *Strawiński Marcin h. Sulima (zm. 1594)*, [w:] *Polski słownik biograficzny*, t. 44, z. 181, Warszawa–Kraków 2006, s. 288–290.

Łowmiański H., *Studia nad dziejami Wielkiego Księstwa Litewskiego*, Poznań 1983.

Łozowski P., *Rodzina w Starej i Nowej Warszawie w XV i początkach XVI wieku*, Białystok 2021.

Marzalûk Ì.A., *Magìlëй u XII–XVIII stst.Lûdzì ì rèčy,* Magìlëŭ-Mìnsk 1998 [Марзалюк І.А., *Магілёў у XII–XVIII стст. Людзі і рэчы*, Магілёў-Мінск 1998].

Meleško V.I., *Mogilev v XVI–Seredinexvii v XVI–seredine XVII v.,* Minsk 1988 [Мелешко В.И., *Могилев в XVI–середине XVII в.*, Минск 1988].

Nasevìč V., *Magìlëйskaâ volasc',* [w:] *Vâlìkae Knâstvalìtoйskae: Èncyklapedyâ,* u 2 t., t. 2, rèdkal.: G.P. Paškoй (gal. rèd.) ì ìnš.,2-e vyd., Mìnsk 2007, s. 245–246 [Насевіч В., *Магілёўская воласць*, [w:] *Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя*, у 2 т., т. 2, рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш., 2-е выд., Мінск 2007, с. 245–246].

Pęcherzewski K., *Mohylew i jego mieszkańcy w latach 1577–1580: w świetle ksiąg magistratu mohylewskiego*, „Czasy Nowożytne" 2007, t. 20, s. 11–66.

Phythian-Adams C., *Local History and Societal History*, "Local Population Studies" 1993, no. 51, p. 30–45.

Repina L.P., *Istoričeskaâ nauka na rubeže XX–XXI vv.: social'nye teorii iistoriografičeskaâ praktika,* Moskva 2011 [Репина Л.П., *Историческая наука на рубеже XX–XXI вв.: социальные теории и историографическая практика*, Москва 2011].

Sìnčuk Ì., *Čyrvony zloty,* [w:] *Vâlìkae Knâstvalìtoйskae: Èncyklapedyâ,* u 2 t., t. 2, rèdkal.: G.P. Paškoй (gal. rèd.) ì ìnš.,2-e vyd., Mìnsk 2007, s. 747 [Сінчук І., *Чырвоны злоты*, [w:] *Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя*, у 2 т., т. 2, рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш., 2-е выд., Мінск 2007, с. 747].

Spicer A., *Confessional Space and Identity in Central and Eastern Europe*, [w:] *Formierungen des konfessionellen Raumes in Ostmitteleuropa*, ed. E. Wetter, Stuttgart 2008, p. 335–342.

Starčenko N., *Čest', krov ì ritorika.Konflìkt u šlâhets'komu seredovìŝì Volinì druga polovina XVI–XVII stolìttâ),* Kiïv 2014 [Старченко Н., *Честь, кров і риторика. Конфлікт у шляхетському середовищі Волині (друга половина XVI–XVII століття)*, Київ 2014].

*Strategìï ta rituali konflìktu: šlâhets'kijsocìum Volinì zlamu XVI ì XVII st. Džerela ta ìnterpretacìï,* Uporâdnikn.P. Starčenko; vìdp. red. G.V. Borâk, Kiïv 2020 [*Стратегії та ритуали конфлікту: шляхетський соціум Волині зламу XVI і XVII ст. Джерела та інтерпретації*, упорядник Н.П. Старченко; відп. ред. Г.В. Боряк, Київ 2020].

Suša A., *Barkalabaйskì letapìs Cìbarkalabaйskì letapìsny spìs?* "Belaruskì gìstaryčny časopìs" 2013, nr 8, s. 5–18 [Суша А., *Баркалабаўскі летапіс ці Баркалабаўскі летапісны спіс?* "Беларускі гістарычны часопіс" 2013, nr 8, с. 5–18].

Śliwa T., *Teofan-Bohdan Rypiński – arcybiskup połocki, biskup witebski i mścisławski (1576–1588)*, „Premislia Christiana" 1988–1989, t. 2, s. 227–234.
*Trusaй A., Magìlëŭskaâ ratuša, [w:] Vâlìkae Knâstvalìtoŭskae: Èncyklapedyâ,* u 2 t., t. 2, rèdkal.: G.P. Paškoŭ (gal.rèd.) ì ìnš., 2-e vyd., Mìnsk 2007, s. 247 [Трусаў А., *Магілёўская ратуша,* [w:] *Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя*, у 2 т., т. 2, рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш., 2-е выд., Мінск 2007, с. 247].
Zemon Davis N., *The Shapes of Social History*, "Storia della Storiografia" 1990, vol. 17, f. 2, p. 28–34.
Žudro F., *Istoriâ Mogilevskogo Bogoâvlenskogobratstva,* Mogilev na Dnepre 1890 [Жудро Ф., *История Могилевского Богоявленского братства*, Могилев на Днепре 1890].

## Tavern, Monastery, Magistrate: Social Relations in Mahilou on the Background of the Singled-Out Conflict of 1577.

The article explores the features of social relations in the urban communities of the eastern lands of the Grand Duchy of Lithuania at the end of the 16th century, using a singled-out conflict. The conflict took place in Mahilou in April 1577. This collision attracts attention in all respects – its time, place, participants, and outcome. The violent clash occurred immediately after Easter, the most principal feast of Christianity, on Easter Monday. The events took place in key places of city life – a tavern, monastery, and magistrate. Members of different estates and social groups were involved in the collision – burghers, nobility, and Orthodox clergy. Despite the rather serious level of violence, both sides of the conflict settled all claims peacefully, without bringing the matter to a court decision. In our opinion, it is the very case that provides an opportunity to reflect connections and interactions between various groups of the urban community, their norms and values, mentality and behavior codes. In the second half of the 16th and the first half of the 17th century, Mahilou was one of the most developed cities of the Grand Duchy of Lithuania and played an important role in the development of trade and craft activities in the upper basin of the Dnieper. Although the history of Mahilou has a detailed historiography, the local urban community was not considerably examined by historians. The research is based on the first books of Mahilou magistrate that have survived to this day. The methodological basis of the analysis is the case study method. The article emphasizes that investigations of local conflicts provide in-depth research of the social history of the Grand Duchy of Lithuania.
K e y w o r d s: social relations, conflict, urban community, right of patronage, Grand Duchy of Lithuania, Mahilou, case study